УДК 947.6 (1921-1939)

***Віталь Пятровіч Гарматны***
*канд. гіст. навук, ст. навук. супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі*
*Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Vital Harmatny***
*Candidate of Historical Sciences,*
*Senior Research Fellow of the Department of Contemporary History of Belarus*
*of the Institute of History of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: vitharmatny@mail.ru

# РАЗВІЦЦЁ АГРАРНАЙ СФЕРЫ ПРУЖАНСКАГА ПАВЕТА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў 1921–1939 гг.

*У 1921–1939 гг. землі Пружаншчыны з'яўляліся часткай народна-гаспадарчага комплекса Польшчы. Пераважную большасць насельніцтва складалі сяляне, якія пакутавалі ад малазямелля і забалочанасці, таму аграрнае пытанне стаяла вельмі востра. Разам з тым польскія ўлады адзначалі, што ворнай зямлі не хопіць на ўсіх яе жадаючых, таму пры правядзенні аграрных пераўтварэнняў падкрэслівалі неабходнасць пераводу гаспадарання на якасна новы ўзровень, у сувязі з чым ажыццявілі тут шэраг карэнных пераўтварэнняў з мэтай стварэння вялікай колькасці самастойных вытворчых і эканамічна моцных гаспадарак.*

***Ключавыя словы:*** *Пружаншчына, зямля, сельская гаспадарка, ураджайнасць, хутар, асаднік, меліярацыя, камасацыя, сервітут.*

## *Development of the Agricultural Sphere Pruzhany Region Polesie Woiwodeship in 1921–1939*

*In 1921–1939 lands of the Pruzhany region were an integral part of the national and economic complex of contemporary Poland. The main part of the population remained peasants, which in their vast majority suffered from small land and soil pollution, so the agrarian question was very actual. At the same time, the Polish authorities noted that there is not enough arable land for all those who want it, therefore when carrying out agrarian transformations, they emphasized the need to transfer management to a qualitatively new level, in connection with which they carried out a number of fundamental transformations here with the aim of creating a large number of independent derivatives and economically strong households.*

***Key words:*** *Pruzhanshchyna, land, agriculture, productivity, farm, settlement, land reclamation, land consolidation, easement.*

### Уводзіны

У 1921–1939 гг. заходнебеларускія землі ўваходзілі ў склад Польскай дзяржавы і былі ў адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльным уладкаваннем падзелены на ваяводствы, паветы і гміны.

1 сакавіка 1921 г. польскімі ўладамі быў створаны Пружанскі павет (12 сельскіх гмін, у 1939 г. – 10), які ахопліваў большую частку сучасных Пружанскага і Бярозаўскага раёнаў, за выключэннем Ружан, Песак і іх ваколіц, якія адносіліся да Косаўскага павета. Агульная плошча Пружанскага павета складала 2 643,9 км$^2$, колькасць насельніцтва – 108 600 чалавек (84,4 % – сяляне), шчыльнасць – 41 чалавек на 1 км$^2$ (1931 г.) [1, s. 335]. Адміністрацыйным і сацыяльна-эканамічным цэнтрам павета было мястэчка Пружаны, якое, паводле перапісу 1921 г., налічвала 6 332 жыхары. Аднак местачкоўцы ў сваёй большасці вялі напаўвясковы лад жыцця і займаліся сельскай гаспадаркай і гандлем дзякуючы знаходжанню на перакрыжаванні дарог [2; 3, s. 105–106]. Буйнымі населенымі пунктамі павета, тыпова палескімі мястэчкамі, былі Бяроза-Картузская і Шэрашава (3 526 і 3 310 жыхароў адпаведна) [4, s. 116; 5, s. 51]. Згодна з ацэнкамі польскіх даследчыкаў, нацыянальная структура насельніцтва Пружанскага павета выглядала наступным чынам: беларусы – 46,7 %, палякі – 44,2 %, яўрэі – 8,8 %, рускія – 0,2 % [6, s. 306].

Асобныя аспекты развіцця аграрнай сферы Пружаншчыны ў 1920-я – 1930-я гг. знайшлі адлюстраванне ў працах В. М. Папко, якія падрыхтаваны на багатай фактала-гічнай і крыніцавай базе [2; 7].

Асаблівую ўвагу належыць надаць працы П. Засіма па вывучэнні матэрыяльнага стану сялянства вёскі Шэні [8]. Разам з тым у цэлым пытанне стану сельскагаспа-

дарчай галіны Пружаншчыны ў міжваенны перыяд да гэтага часу не знайшло належнага навуковага асвятлення і таму патрабуе вывучэння.

**Эканамічны стан насельніцтва**

Паводле ацэнак даследчыкаў у 1931 г. толькі 2,7 % землеўласнікаў Пружаншчыны вялі капіталістычную гаспадарку, у той час як 93,4 % – дробнатаварную [1, s. 347]. У параўнанні з сялянамі іншых паветаў Палескага ваяводства сяляне Пружаншчыны былі больш заможнымі дзякуючы большай колькасці свойскай жывёлы ў асабістых гаспадарках (у параўнанні з найбольш адсталымі ў гэтым плане Лунінецкім і Столінскім паветамі больш чым у 3 разы) [9, с. 58]. Разам з тым у тагачаснай публіцыстыцы захаваліся і даволі крытычныя ацэнкі дабрабыту мясцовага насельніцтва: «Жыццё на вёсцы ніколі не было на Пружаншчыне на высокім узроўні развіцця… Цяпер ва ўмовах усеагульнага аграрнага крызісу павялічылася ўсеагульная беднасць вёскі. Няма сапраўднага голаду, але і недахоп самага патрэбнага з’яўляецца не раз адчувальным. Да гаротнай стравы, якая складаецца галоўным чынам з бульбы, капусты і часам хлеба, часта… бракуе нават дробкі солі, а пра цукар і казаць не прыходзіцца» [4, s. 117].

Згодна з матэрыяламі перапісу 1921 г. структура землеўладання на Пружаншчыне выглядала наступным чынам: плошчай зямлі да 2 га валодалі 11,7 % сямей, 2–5 га – 29,0 %, 5–20 га – 53,4 %, 20–100 га – 5,2 %, звыш 100 га – 0,8 % [6, s. 308]. Напрыклад, у гміне Малеч налічвалася 3 407 гаспадарак, з якіх менш чым 1 га зямлі валодалі 82 гаспадаркі, 1–2 га – 637, 5–10 га – 1 815, 15–50 га – 278, 50 га і больш – 6. Большасць сялян гміны па памерах надзелаў і дабрабыту адносілася да серадняко ў (мелі да 7 га зямлі). Маёмасць сялян абкладвалася шматлікімі падаткамі: на нерухомасць – 25 злотых за 1 $м^3$, пазямельны – 4 злотых за 1 га, на членаў сям’і – 6,33 злотых на 1 чалавека.

На тэрыторыі гміны налічвалася 2 796 коней, 6 772 каровы, 686 авечак і ўсяго тры казы. Конь каштаваў 120–300 злотых, карова – 120–180, авечка ці каза – 8–15. У гаспадарцы сярэдняй сям’і было 2–3 кані і каровы, 4–5 авечак [10, с. 142].

Ураджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур паводле статыстычных звестак у Пружанскім павеце была вышэйшай у параўнанні з сярэдняй па ваяводству і амаль не саступала агульнапольскай, што стварала магчымасці для павышэння дабрабыту мясцовага сялянства. У цэлым згодна з паказчыкамі ўраджайнасці Пружанскі павет быў адным з чатырох цалкам самаакупаемых у Палескім ваяводстве [11, s. 2].

Дадзеныя аб ураджайнасці асноўных сельскагаспадарчых культур на землях Пружанскага павета ў параўнанні з агульнапольскімі паказчыкамі прыведзены ніжэй ў табліцы [12, s. 133].

Табліца. – Сярэдняя ўраджайнасць сельскагаспадарчых культур у Пружанскім павеце ў 1925–1935 гг., ц/га

| | Пшаніца | Жыта | Ячмень | Авёс | Бульба |
|---|---|---|---|---|---|
| Пружанскі павет | 12,1 | 11,7 | 10,8 | 10,6 | 110 |
| Польшча | 12,1 | 11,1 | 12,3 | 11,6 | 121 |

**Насаджэнне асадніцтва**

Першым этапам польскіх аграрных мерапрыемстваў на Пружаншчыне з’яўляецца перасяленне сюды з Польшчы асаднікаў, якія, па сутнасці, ігралі тут ролю каланістаў і сацыяльнай апоры польскага панавання на вёсцы. Ужо ў пачатку 1923 г. для насаджэння асаднікаў у Пружанскім павеце ўлады перадалі 5 500 га зямлі [13, с. 77]. Дзяржава аказвала асаднікам істотную дапамогу: выдавала ільготныя крэдыты, перадавала сельскагаспадарчы інвентар і драўніну на забудову, – але нават такой дапамогі часта было недастаткова для паўнавартаснай арганізацыі гаспадарання на новым месцы [14, с. 143]. Так, 12 сакавіка 1928 г. А. Задарноўскі, асаднік з Казіміраўкі (гміна Пружаны), у чарговы раз звярнуўся з просьбай аб выдзяленні яму пазыкі ў суме 2 500 злотых на 15 гадоў для заканчэння будоўлі стадолы і выплаты раней узятай пазыкі з Касы Стэфчыка. Пра сябе Задарноўскі паведамляў, што на асадзе гаспадарыў з 14 мая 1922 г. і валодаў 11 га ворнай зямлі V класа, 5 га кіслых лугоў і 5 га лесу. У 1928 г. засеяў 5 га жыта (ураджайнасць 6 ц/га), 1 га яч-

меню (2 ц/га), 1 га аўсу (2 ц/га), 0,5 га грэчкі (0,5 ц/га), сабраў 7 ц карняплодаў (з 1 га), меў 1 га пашы, 0,5 га лубіну. У гаспадарцы меў два кані і дзве каровы, адну цёлку, чатыры авечкі, чатыры свінні і 25 курэй; з інвентару было: адзін воз, па дзве сахі і бараны, два плугі, сячкарня і інш. За гэты час пабудаваў хату, піўніцу, стайню і распачаў будоўлю стадолы і хлява. Разам з тым былі і страты: прапалі коні ў 1922 і 1927 гг., карова ў 1928 г., у 1927 і 1928 гг. быў неўраджай [15, арк. 60, 68].

Паводле фрагментарных статыстычных звестак усяго ў 1927–1928 гг. у Пружанскім павеце налічвалася 140 асаднікаў у 12 асадах, у 1936 г. – 142 [16, s. 105].

**Ажыццяўленне парцэляцыі**

Ва ўмовах дамінавання ў сельскай гаспадарцы памешчыцкага землеўладання неабходна была падтрымка малазямельных і беззямельных сялян, што адбывалася шляхам продажы ім часткі памешчыцкіх і царкоўных зямель невялікімі надзеламі – парцэламі. У той час ворнай зямлі было мала, таму каштавала яна вельмі дорага, і некаторыя памешчыкі займаліся яе продажам самайстойна і завышалі кошты. Напрыклад, 6 ліпеня 1926 г. Дзяржаўны сельскагаспадарчы банк звярнуўся да Пружанскай зямельнай управы з паведамленнем, што уладальніца маёнтка Здзітава ў гміне Бяроза-Картузская Е. Пагодзіна, нягледзячы на запазычанасць перад банкам, дзе маёнтак быў закладзены, займаецца «дзікай парцэляцыяй». Згодна з рашэннем уладаў ад 13 снежня 1926 г. пакупнікі зямель маёнтка Здзітава разам з зямельнымі надзеламі атрымлівалі і частку пазыкі. Усяго сяляне набылі 329,3426 га і атрымалі 14 296 злотых запазычанасці перад банкам (пад 4,5 % гадавых), за Пагодзінай заставалася 366,8198 га і 11 926 злотых пазыкі [17, арк. 7, 21].

У адаведнасці з законам аб парцэляцыі пад прымусовы падзел не падпадалі маёнткі, якія вялі гаспадарку на высокім узроўні. Напрыклад, мясцовы памешчык Я. Дзяконскі на працягу 1928–1930 гг. вёў перамовы з Пружанскай павятовай зямельнай управай аб захаванні за ім цалкам маёнтка Чахец, што ў цэлым ў яго атрымалася. Разам з тым суседні маёнтак Казімірава быў у 1932 г. часткова падзелены паміж 18 пакупнікамі, якія набылі тут 134,7 га зямлі [8, с. 131–135].

Па гэтай жа прычыне 25 красавіка 1928 г. памешчык М. Чарноцкі прасіў выключыць з парцэляцыі свой маёнтак Белаcоўшчына (гміна Пружаны). Маёнтак быў узнагароджаны ў 1927 г. бронзавым медалём Міністэрства сельскай гаспадаркі за ўзорную гадоўлю чырвонай польскай каровы, пастаўляў на мясцовы рынак цялят і паказваў прыклад папулярызацыі культуры жывёлагадоўлі. Прашэнне ўладамі было задаволена з улікам таго, што з маёнтка ўжо перададзена на парцэляцыю 106,0557 га зямлі; акрамя таго, пры падзеле пашы існавала небяспека перадачы захворванняў ад кароў з суседніх статкаў [18, арк. 21].

**Мерапрыемствы па камасацыі**

Адной з галоўных перашкод на шляху далейшага паспяховага развіцця мясцовай сельскай гаспадаркі з'яўлялася цераспалосіца – наяўнасць у пераважнай большасці мясцовых сялян некалькіх раскіданых надзелаў (у г. зв. «шахматным парадку»), што стварала істотныя цяжкасці па іх апрацоўцы [12, s. 136–137].

З гэтай мэтай паводле закона ад 31 ліпеня 1923 г. польскія ўлады праводзілі камасацыю – аб'яднанне раскіданых зямельных надзелаў з улікам іх грашовай вартасці, перанясеннем сюды хаты і гаспадарчых пабудоў і стварэннем такім чынам хутара. Так, напрыклад, 8 мая 1928 г. улады заключылі дамову з землямерам У. Пагоцкім, што ён 15 мая распачне ў вёсцы Вялікае Міжлессе (гміна Міжлессе) працы па камасацыі надзелаў (агульная плошча – каля 637 га, потым павялічыўся да 812,0682 га, кошт за 1 га – 18 злотых 50 грошаў) [19, арк. 2].

У некаторых выпадках у сувязі з беднасцю сялян улады маглі правесці камасацыю бясплатна [20, арк. 74].

Такія маштабныя пераўтварэнні патрабавалі сур'ёзных капіталаўкладанняў, вялікай колькасці кваліфікаваных спецыялістаў і складання шматлікіх разнастайных дакументаў, што ў цэлым не магло не выклікаць канфліктаў і ў выніку істотна замаруджвала справу [13, с. 95]. Так, 12 мая 1928 г. пружанскі павятовы зямельны камісар паведамляў у акруговую зямельную ўправу, што памочнік землямера В. Адамчык, які праводзіў працы па камасацыі вё-

скі Вялікае Міжлессе, нягледзячы на тое, што афіцыйна яшчэ не прыступіў да працы ў вёсцы, паводзіў сябе з вяскоўцамі нетактоўна, вымагаў у іх грошы і займаўся рознымі махінацыямі. У выніку 10 мая член мясцовай рады М. Гарматны ад імя жыхароў вёскі катэгарычна заявіў, што калі Адамчык працягне ажыццяўляць сваю дзейнасць, то рада ссялення адмовіцца ад мандатаў. Улічваючы, што в. Міжлессе на тэрыторыі Пружанскага павету характарызавалася як узорная (дзякуючы наяўнасці многіх культурных, сацыяльных і грамадскіх кааператыўных суполак), працяг працы Адамчыка мог падарваць аўтарытэт зямельных органаў і адмоўна адбіцца на правядзенні камасацыі ва ўсім Пружанскім павеце [19, арк. 12], і таму яго звольнілі.

Усяго на 1 красавіка 1937 г. у Пружанскім павеце ў выніку камасацыі было ўтворана 42 вёскі агульнай плошчай зямельных надзелаў 34 320 га, што складала 23,3 % ад запланаванага. На наступны год планавалі завяршыць тут камасацыю 32 вёсак плошчай 26 488 га (18,0 %) [21, s. 15].

**Правядзенне меліярацыі**

Пры значнай забалочанасці тэрыторыі Пружанскага павета асаблівае значэнне набывалі меліярацыйныя мерапрыемствы – асушэнне забалот, у выніку чаго істотна пашыралася плошча ворных зямель. Пры сярэдняй забалочанасці 40 % тэрыторыі Палескага ваяводства, у Пружанскім павеце гэты паказчык складаў 19,24 %, што таксама было нямала [6, s. 179].

З мэтай зніжэння агульных выдаткаў на правялзенне меліярацыі шырока выкарыстоўваліся «шарваркі» – натуральныя працоўныя павіннасці, калі асушэнне зямель, найперш пракопванне каналаў, ажыццяўлялася рукамі і інвентаром саміх сялян пад наглядам спецыялістаў. Напрыклад, у 1932–1933 гг. праграма меліярацыі гміны Міжлессе прадугледжвала расчыстку 21,5 км каналаў, а таксама выкопванне новага канала даўжынёй 20,5 км. У гэтых работах былі задзейнічаны 10 650 чалавек [22, с. 84–85].

**Ліквідацыя сервітутаў**

Самай супярэчлівай часткай аграрных пераўтварэнняў стала ліквідацыя сервітутаў – права сумеснага карыстання сялянамі і памешчыкамі агульных угоддзяў (лесу, пашы, рэк). Згодна з капіталістычным прынцыпам гаспадарання кожная маёмасць павінна мець толькі аднаго ўласніка, але, дзякуючы сервітутам, сяляне маглі карыстацца значнымі дадатковымі магчымасцямі для ўтрымання асабістай гаспадаркі. У некаторых выпадках сервітутамі карысталіся сяляне некалькіх вёсак, што стварала сур'ёзныя перашкоды пры ажыццяўленні камасацыі. Так, 26 мая 1931 г. у гміне Сігневічы быў завершаны падзел агульнай пашы вёсак Падоссе і Вінін. Пры падзеле пашы ўлады кіраваліся агульнай плошчай зямельных надзелаў вяскоўцаў і якасцю лугоў. Па выніках падзелу 22,75 га пашы перайшло сялянам Падосся, а 8,72 га – жыхарам Вініна [23, арк. 4–5].

Пры ліквідацыі сервітутаў сяляне атрымлівалі ад уладаў кампенсацыю, але звычайна лічылі яе відавочна недастатковай, а сябе – пакрыўджанымі. Так, восенню 1927 г. у газеце «Сялянская ніва» была змешчана карэспандэнцыя селяніна в. Сашыца (гміна Сялец): «Апошнія дні ў вёсцы праводзіцца ліквідацыя сервітутаў на чале з памешчыкам панам Рэдзікам. Гэтая "ліквідацыя", як яе называюць, мае на ўвазе адабраць ад сялян іх уласныя землі і передаць памешчыкам» [9, с. 37].

Актыўны супраціў ліквідацыі сервітутаў арганізоўвалі камуністы. Напрыклад, так пад іх уплывам 30 верасня 1929 г. сяляне вёсак Осаўцы і Пляхаўшчына прагналі зямлямера, а ў пачатку студзеня 1933 г. сяляне в. Хорава на чале з камуністамі выступілі супраць ліквідацыі сервітута і не дапусцілі зямлямера да работы [24, с. 139].

**Заключэнне**

На працягу 1921–1939 гг. польскім уладам удалося, нягледзячы на ўсе цяжкасці, правесці на тэрыторыі Пружанскага павета шэраг карэнных аграрных пераўтварэнняў з мэтай усталявання тут эканамічна моцнай капіталістычнай таварна-рынкавай сельскай гаспадаркі. Так, былі пераадолены пасляваенныя страты, павысілася агульная агратэхнічная культура апрацоўкі зямлі і арганізацыі асабістай гаспадаркі, павялічылася плошча ворных зямель, даволі істотна вырасла ўраджайнасць асноўных сельскагаспадарчых культур, павысіўся дабрабыт мясцовага сялянства.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Tomaszewski, J. Struktura społeczna województwa Poleskiego w 1931 r. / J. Tomaszewski // Kwart. Historyczny. – 1962. – Z. 2. – S. 335–359.

2. Папко, В. М. Адлюстраванне паўсюдзённага жыцця павятовага горада Пружаны ў 1921–1939 гг. у дакументах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці / В. М. Папко // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі : зб. навук. арт. – Гродна : ГрДУ, 2009. – С. 391–396.

3. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Brześć-nad-Bugiem : Nakładem Oddziału polskiego t-wa krajoznawczego, 1935. – 160 s.

4. Hołub-Pacewiczowa, Z. Z geografii Prużańszczyzny / Z. Hołub-Pacewiczowa // Ziemia. – 1935. – № 6-7. – S. 111–119.

5. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z dnia 30.09.1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : GUS, 1924. – T. 3 : Województwo Poleskie. – 95 s.

6. Niezbrzycki, J. Polesie: opis wojskowo-geograficzny i studjum terenu / J. Niezbrzycki. – Warszawa : Wojskowy in-t nauk.-wydawniczy, 1930. – 455 s.

7. Папко, В. М. Род Дзяконскіх і іх маёнткі на Брэстчыне ў XIX–XX ст. / В. М. Папко. – Брэст : Альтернатива, 2011. – 248 с.

8. Засім, П. Шані, вёска Пружанскага павета. Эканамічнае і сацыяльнае даследаванне / П. Засім // ARCHE: Пачатак. – 2013. – № 4. – С. 359–419.

9. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев. – Минск : Выш. шк., 1975. – 110 с.

10. Кенда, А. Организация и деятельность Малечской гмины Пружанского повета в 1921–1939 гг. / А. Кенда // Беларусь і Польшча ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах : зб. матэрыялаў Міжнар. студэнц. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2000 г. – Брэст : Выдав. дом С. Лаўрова, 2001. – С. 140–143.

11. Biskupski, St. Ceny ziemi w województwie poleskiem w latach 1924–1929 / St. Biskupski. – Warszawa : Wydaw. Min. reform rolych, 1931. – 78 s.

12. Śleszyński, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.

13. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 199 с.

14. Утгоф, В. Общественные организации осадников и их деятельность на территории Полесского воеводства (1921–1939 гг.) / В. Утгоф // Беларусь і Польшча ў XX стагоддзі: агульнае і адметнае ў гістарычных лёсах : зб. матэрыялаў Міжнар. студэнц. навук.-практ. канф., Брэст, 7–8 крас. 2000 г. – Брэст : Выдав. дом С. Лаўрова, 2001. – С. 143–146.

15. Заявления военных осадников Брестского, Дрогичинского, Пружанского поветов о выдаче ссуды за 1928–1932 гг. // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр.). – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 141.

16. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe, 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa : Rytm, 2003. – 418 s.

17. Дело о парцелляции земли имения Здзитов гмины Береза-Картузская Пружанского повета, принадлежащей наследникам Елизаветы Погодиной за 1925–1931 гг. // ДАБр. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 569.

18. Дело об освобождении от парцелляции земель им. Белосовщизна гм. Пружанской Пружанского повета за 1928–1930 гг. // ДАБр. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 664.

19. Дело об укрупнении земельных участков деревни Междулесье Большое Междулесье гмины Пружанского повета за 1928–1930 гг. // ДАБр. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 1048.

20. Дело об объединении земель дер. Костюки, Большие и Малые Матеевичи и Михалины, гм. Матеевичской, пов. Пружанского за 1925–1932 гг. // ДАБр. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 980.

21. Sprawozdanie wojewody poleskiego na posiedzenie Rady Wojewódzkiej w grudniu 1937 r. – Brześć-nad-Bugiem : Druk. Związku rezerwistów, 1937. – 88 s.

22. Савіч, А. А. Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. : вучэб.-метад. комплекс / А. А. Савіч. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2017. – 155 с.

23. Дело о разделе совместных пастбищ между деревней Подосье и деревней Винин гмины Сехновичи Пружанского повета за 1932 г. // ДАБр. – Ф. 60. Воп. 1. Спр. 59.

24. Полуян, И. В. Западная Белоруссия в период экономического кризиса 1929–1933 гг. / И.В. Полуян. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 205 с.

REFERENCES

1. Tomaszewski, J. Struktura społeczna województwa Poleskiego w 1931 r. / J. Tomaszewski // Kwart. Historyczny. – 1962. – Z. 2. – S. 335–359.

2. Papko, V. M. Adliustravannie pausiudzionnaha zhyccia paviatovaha horada Pruzhany u 1921–1939 hh. u dakumientakh Dziarzhaunaha arkhiva Bresckaj voblasci / V. M. Papko // Histaryjahrafija i krynicy pa historyi haradou i pracesau urbanizacyi u Bielarusi : zb. navuk. art. – Hrodna : HrDU, 2009. – S. 391–396.

3. Marczak, M. Przewodnik po Polesiu / M. Marczak. – Brześć-nad-Bugiem : Nakładem Oddziału polskiego t-wa krajoznawczego, 1935. – 160 s.

4. Hołub-Pacewiczowa, Z. Z geografii Prużańszczyzny / Z. Hołub-Pacewiczowa // Ziemia. – 1935. – № 6-7. – S. 111–119.

5. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej opracowany na podstawie wyników pierwszego powszechnego spisu ludności z dnia 30.09.1921 r. i innych źródeł urzędowych. – Warszawa : GUS, 1924. – T. 3 : Województwo Poleskie. – 95 s.

6. Niezbrzycki, J. Polesie: opis wojskowo-geograficzny i studjum terenu / J. Niezbrzycki. – Warszawa : Wojskowy in-t nauk.-wydawniczy, 1930. – 455 s.

7. Papko, V. M. Rod Dziakonskikh i ikh majontki na Brestchynie u XIX–XX st. / V. M. Papko. – Brest : Al’ternativa, 2011. – 248 s.

8. Zasim, P. Shani, vioska Pruzhanskaha pavieta. Ekanamichnaje i sacyjal’naje dasliedavannie / P. Zasim // ARCHE: Pachatak. – 2013. – № 4. – S. 359–419.

9. Kukhariev, B. Ye. Siel’skoje khoziajstvo Zapadnoj Bielorussii (1919–1939 gg.) / B. Ye. Kukhariev. – Minsk : Vysh. shk., 1975. – 110 s.

10. Kienda, A. Organizacija i diejatiel’nost’ Maliechskoj gminy Pruzhanskogo povieta v 1921–1939 gg. / A. Kienda // Bielarus’ i Pol’shcha u XX stagoddzi: ahul’naje i admietnaje u histarychnykh lioskah : zb. materyjalau Mizhnar. studenc. navuk.-prakt. kanf., Brest, 7–8 kras. 2000 h. – Brest : Vydaw. dom S. Laurova, 2001. – S. 140–143.

11. Biskupski, St. Ceny ziemi w województwie poleskiem w latach 1924–1929 / St. Biskupski. – Warszawa : Wydaw. Min. reform rolych, 1931. – 78 s.

12. Śleszyński, W. Województwo Poleskie / W. Śleszyński. – Kraków : Avalon, 2014. – 335 s.

13. Sorokin, A. A. Agrarnyj vopros v Zapadnoj Bielorussii (1920–1939 gg.) / A. A. Sorokin. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1968. – 199 s.

14. Utgof, V. Obshchiestviennyje organizacii osadnikov i ikh diejatiel’nost’ na tierritorii Poliesskogo vojevodstva (1921–1939 gg.) / V. Utgof // Bielarus’ i Pol’shcha u XX stagoddzi: ahul’naje i admietnaje u histarychnykh liosakh : zb. materyjalau Mizhnar. studenc. navuk.-prakt. kanf., Brest, 7–8 kras. 2000 h. – Brest : Vydaw. dom S. Laurova, 2001. – S. 143–146.

15. Zajavlienija vojennykh osadnikov Briestskogo, Drogichinskogo, Pruzhanskogo povietov o vydachie ssudy za 1928–1932 gg. // Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci (DABr.). – F. 60. Vop. 1. Spr. 141.

16. Stobniak-Smogorzewska, J. Kresowe osadnictwo wojskowe, 1920–1945 / J. Stobniak-Smogorzewska. – Warszawa : Rytm, 2003. – 418 s.

17. Dielo o parcelliacii ziemli imienija Zdzitov gminy Bierioza-Kartuzskaja Pruzhanskogo povieta, prinadliezhashchiej nasliednikam Yelizaviety Pogodinoj za 1925–1931 gg. // DABr. – F. 60. Vop. 1. Spr. 569.

18. Dielo ob osvobozhdienii ot parcelliacii ziemiel’ im. Bielosovshchizna gm. Pruzhanskoj Pruzhanskogo povieta za 1928–1930 gg. // DABr. – F. 60. Vop. 1. Spr. 664.

19. Dielo ob ukrupnienii ziemiel’nykh uchastkov dierievni Miezhdulies’je Bol’shoje Miezhdulies’je gminy Pruzhanskogo povieta za 1928–1930 gg. // DABr. – F. 60. Vop. 1. Spr. 1048.

20. Dielo ob objedinienii ziemiel’ dier. Kostiuki, Bol’shije i Malyje Matiejevichi i Mikhaliny, gm. Matiejevichskoj, pov. Pruzhanskogo za 1925–1932 gg. // DABr. – F. 60. Vop. 1. Spr. 980.

21. Sprawozdanie wojewody poleskiego na posiedzenie Rady Wojewódzkiej w grudniu 1937 r. – Brześć-nad-Bugiem : Druk. Związku rezerwistów, 1937. – 88 s.

22. Savich, A. A. Sacyjal’na-ekanamichnaje i hramadska-palitychnaje stanovishcha u Zakhodniaj Bielarusi u 1921–1939 hh. : vucheb.-mietad. komplieks / A. A. Savich. – Brest : BrDU imia A. S. Pushkina, 2017. – 155 s.

23. Dielo o razdielie sovmiestnykh pastbishch miezhdu dierievniej Podos’je i dierievniej Vinin gminy Siekhnovichi Pruzhanskogo povieta za 1932 g. // DABr. – F. 60. Vop. 1. Spr. 59.

24. Polujan, I. V. Zapadnaja Bielorussija v pieriod ekonomichieskogo krizisa 1929–1933 gg. / I. V. Polujan. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1991. – 205 c.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 12.09.2022*